# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 7 (850) | Аўторак, 6 красавіка 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Яго чарговае пасяджэнне адбылося 25 сакавіка. Перад пачаткам разгляду пытанняў, вынесеных на парадак дня, члены вучонага савета мінутай маўчання ўшанавалі памяць памёршага 15 сакавіка г. г. былога рэктара ГДУ акадэміка Б. В. Бокуця.

Па дакладах загадчыцы кафедры беларускай мовы А. А. Станкевіч і дэкана факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі А. У. Гаўрылюка заслуханы і абмеркаваны адпаведна пытанні аб выніках выкладання беларускай мовы на нефілалагічных спецыяльнасцях; аб змесце і якасці выкладання спецыяльных дысцыплін у спецыялізаванай школе пры універсітэце.

Па інфармацыі прарэктара па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях А. П. Кармазіна зацверджаны палажэнні аб прэміраванні і аб парадку ўстанаўлення надбавак да насадавых акладаў (тарыфных ставак) супрацоўнікам універсітэта.

На вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

На вучоным савеце разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ПА ШЛЯХУ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Яшчэ няма і двух гадоў, як устаноўлены двухбаковыя адносіны паміж нашым універсітэтам і Пекінскім упраўленнем вышэйшай адукацыі. Аднак за гэты параўнаўча кароткі час сувязі паміж імі прыкметна ўзмацніліся і працягваюць развівацца.

Вось і нядаўна ГДУ наведала дэлегацыя работнікаў вышэйшай адукацыі са сталіцы КНР. Яе ўзначальваў старшыня дырэкцыі Пекінскага муніцыпальнага бюро вышэйшай адукацыі Ін Дунг-Нянь. Разам з ім Гомель наведалі рэктары Пекінскага фінансавага інстытута Чэн-Ры-Сін, Пекінскага аб'яднанага універсітэта Чжань Южу, Пекінскага эканамічнага коледжа Лу Хузн-Ця, прарэктар Пекінскага аб'яднанага універсітэта Юань Ця-Цон і загадчыца кафедры рускай мовы Пекінскага педагагічнага інстытута Ян Сю-Цзе.

Мэтай іх знаходжання было азнаямленне з ВНУ Гомеля і абмеркаванне пытанняў падрыхтоўкі спецыялістаў для Кітайскай Народнай Рэспублікі.

На сустрэчы ў рэктарацы ГДУ члены кітайскай дэлегацыі пазнаёміліся з кіраўнікамі, дэканамі, вядучымі вучонымі і спецыялістамі універсітэта. Адбылася грунтоўная размова аб сістэме адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і, у прыватнасці, у Гомельскім дзярж-універсітэце. Яго першы прарэктар прафесар М. В. Селькін расказаў пра ГДУ і перспектывы яго далейшага развіцця. Аб спецыяльнасцях, па якіх рыхтуюцца кадры ў вядучай навучальнай установе Беларускага Палесся, навуковых і



спартыўных дасягненнях гаварылі дэканы матэматычнага, фізічнага, эканамічнага, біялагічнага, геалагічнага факультэтаў і факультэта фізічнай культуры. Затым госці азнаёміліся з універсітэтам, яго факультэтамі, лабараторыямі, інтэрнатамі. Найбольшую цікавасць у іх выклікаў фізічны факультэт і навуковыя лабараторыі кафедры оптыкі **(на здымку).**

Кітайская дэлегацыя наведала таксама Гомельскі політэхнічны інстытут і Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Акрамя знаёмства з імі, тут таксама адбылася дзелавая размова аб пераходзе да шматступеньчатай сістэмы адукацыі. Былі вызначаны перспектывы супрацоўніцтва з роднаснымі ВНУ Пекіна.

У час знаходжання на Гомельшчыне госці наведалі саўгас «Брылёва», які спецыялізуецца на вырошчванні гародніннных культур. Яго дырэктар А. Т. Кобрусеў расказаў пра дасягненні гаспадаркі і перспектывы яе развіцця, азнаёміў з жывёлагадоўчым комплексам, дваром механізатараў, цяпліцамі. Кітайскія сябры наведалі саўгасны дзіцячы сад «Сонейка», мясцовую дзіцячую школу.

Разнастайнай была і культурная праграма. Госці з Кітая азнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі Гомеля, паркам культуры і адпачынку імя Луначарскага, наведалі краязнаўчы і гістарычны музеі, Сабор Пятра і Паўла, з задавальненнем паглядзелі прадстаўленне майстроў цыркавога мастацтва.

Развітваючыся з беларускай зямлёй, госці выказалі шчырую ўдзячнасць за аказаны ім цёплы прыём. Вынікам іх візіту стане новае падпісанне дагавору аб далейшым супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай школы і навукі.

**Т. ЯРОМІНА,**
**спецыяліст аддзела міжнародных сувязей.**

## З ДЫПЛОМАМІ Ў... БЕСПРАЦОЎНЫЯ

Як кажуць у народзе, студэнцкія гады нібы птаха: пралятаюць вельмі хутка і непрыкметна. Пацвердзіць гэта могуць і сёлетнія выпускнікі. З кожным днём для іх набліжаецца час развітання з сябрамі па вучобе, выкладчыкамі, інтэрнатамі, якія замянялі родны дом, універсітэтам. Наперадзе засталіся толькі дзяржаўныя экзамены і абарона дыпломных работ. А пасля гэтага і радаснае, і крыху сумнае развітанне. Дарэчы, для некаторай часткі студэнтаў яно стане сумным у поўным сэнсе слова, бо, атрымаўшы дыпломы, яны застаюцца самі з сабою, пакуль што без усякай перспектывы на будучыню. А дакладней кажучы, з дыпломамі аб універсітэцкай адукацыі папоўняць рады беспрацоўных. Гэта стала вядомым пасля індывідуальнага размеркавання сёлетніх выпускнікоў, якое на працягу трох дзён праходзіла ў рэктарацы.

У 1993 г дыпломы аб заканчэнні ГДУ павінны атрымаць 723 маладыя спецыялісты. Усе яны прайшлі перад дзяржаўнай размеркавальнай камісіяй. Найбольш пашчасціла выпускнікам філфака. Па-сутнасці, у іх не было ніякіх праблем. 103 выхаванцы беларускага і рускага аддзяленняў атрымалі пуцёўкі ў самастойнае працоўнае жыццё і толькі 7 чалавекам па розных уважлівых прычынах дадзена права на самастойнае працаўладкаванне. А вось на некаторых іншых факультэтах сітуацыя склалася зусім інакшая. У першую чаргу гэта датычыцца эканомфака. 125 яго выпускнікоў са 154 пакуль што застаюцца ні з чым. Для працаўладкавання ім не знайшлося месцаў. Асабліва трывожнае становішча склалася па спецыяльнасці «Бухулік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці». Сёлета па ёй адбудзецца першы выпуск. На жаль, толькі 9 выпускнікам з 59 знайшліся месцы для працаўладкавання. Аналагічная з'ява і з тымі, хто атрымаў вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка і АСК».

Усяго ж з-за адсутнасці месцаў самі павінны будуць працаўладкоўвацца 158 сёлетніх выпускнікоў нашага універсітэта.

Нельга не сказаць і пра тое, што значная колькасць прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, якія ў свой час заключылі з універсітэтам індывідуальныя дагаворы аб падрыхтоўцы спецыялістаў, перад размеркаваннем, а то і раней, адмовіліся ад іх. Толькі па эканамічнаму факультэту такіх аказалася 28 чалавек.

Зразумела, Гомельшчына, як і ўся наша рэспубліка, знаходзіцца цяпер у цяжкім эканамічным становішчы. Зніжаецца аб'ём вытворчасці, назіраецца значны адток рабочай сілы, тыднямі, а то і месяцамі прастойваюць асобныя цэхі і нават цэлыя прадпрыемствы. І ўсё ж гэтыя факты не могуць служыць апраўданнем таго, што сённяшнія маладыя спецыялісты, яшчэ поўныя энергіі і жадання прымяніць на практыцы набытыя веды, застаюцца пакінутымі на волю лёсу. Тут агульнымі намаганнямі патрэбна шукаць нейкае выйсце.

## АБРАНЫ НА ВАКАНТНЫЯ ПАСАДЫ

На сакавіцкіх пасяджэннях вучонага савета універсітэта па конкурсу на вакантныя пасады выбраны дацэнтамі: **П. Д. Грыгарук** — па кафедры ВМ і праграміравання; **С. Ф. Камornікаў** — па кафедры алгебры і геаметрыі; **Ю. А. Кашын, У. Ф. Філіпцоў** — па кафедры дыфураўненняў; **У. Р. Ермакоў** — па кафедры матаналізу; **Л. Ф. Кахоўская** — па кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства; **Э. М. Інспектараў** — па кафедры радыёфізікі, **У. М. Услоў** — па кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці, **З. М. Сямейных** — па кафедры гісторыі ўсходнеславянскіх народаў, **В. І. Смыкоўская** — па кафедры беларускай літаратуры. **І. К. Жылiна** — па кафедры англійскай мовы. Старшымі выкладчыкамі выбраны: **Г. П. Барадзіна, П. П. Саковіч** — па кафедры фізічнага выхавання, **Т. П. Жалонкіна** — па кафедры агульнай фізікі, **Т. І. Асяніна** — па кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК, **М. С. Далінскі** — па кафедры МПК, **Ф. У. Чарапкоўскі** — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.

На конкурснай аснове рэкамендаваны Атэстацыйнай калегіі Рэспублікі Беларусь да прысваення вучонага звання прафесар загадчыца кафедры беларускай мовы дацэнт **А. А. Станкевіч** і кандыдат геолага-мінералагічных навук з кафедры геафізікі **Ю. П. Іваноў** — вучонага звання дацэнт.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры оптыкі Валерыя Пятровіча ЗЯЛЁНАГА (навуковыя кіраўнікі — прафесар А. М. Сердзюкоў, вядучы навуковы супрацоўнік Г. С. Міцюрыч) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук

